# Гісторыя

І.А. ВІДАНАВА

## АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ПЕРЫЯДУ ФЕАДАЛЬНАЙ РАЗДРОБНЕНАСЦІ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ

Пры вывучэнні гісторыі Беларусі IX–XIII ст. найбольшая ўвага традыцыйна надавалася такім праблемам, як узнікненне першых княстваў-дзяржаў, генезіс Полацкага княства і ўтварэнне Вялікага княства Літоўскага. Аднак дзяржаваўтваральны працэс, які ў XI ст. быў скіраваны на ўмацаванне магутнага феадальнага княства з адзіным цэнтрам, у XII ст. пасля смерці Усяслава Полацкага страчвае сваю лінейнасць. Драбленне Полацкага княства, актывізацыя шэрага асобных рэгіянальных цэнтраў і, як следства, шматвектарнасць палітычнай гісторыі беларускіх зямель у перыяд феадальнай раздробненасці пры першасным набліжэнні да праблемы сведчаць пра пэўную запаволенасць, калі не прыпыненне, дзяржаваўтваральных працэсаў у гэты час. У выніку перыяд феадальнай раздробненасці апынуўся адным з найменш даследаваных у сярэднявечнай гісторыі Беларусі. Доўгі час ён разглядаўся як своеасаблівая пераходная стадыя ад аднаго феадальнага дзяржаўнага ўтварэння на беларускіх землях (Полацкае княства) да другога (Вялікае княства Літоўскае) і не выдзяляўся ў асобны этап.

Храналагічныя межы перыяду феадальнай раздробненасці вызначаюцца даволі ўмоўна. Яго пачатак звязваюць са смерцю Усяслава Полацкага (1101) і падзелам Полацкага княства паміж яго сынамі, а заканчэнне – з фарміраваннем Вялікага княства Літоўскага (сярэдзіна XIII ст.). Аднак беларускія землі ўваходзілі ў склад новага дзяржаўнага аб'яднання паступова, і гэты працэс працягваўся да сярэдзіны XIV ст. Таму можна сцвярджаць, што перыяд феадальнай раздробненасці на Беларусі ахоплівае XII і XIII ст. і канчаткова завяршаецца з уваходжаннем усіх беларускіх зямель у склад Вялікага княства Літоўскага.

Вывучэнне беларускага сярэднявечча распачынаецца творамі беларускіх гісторыкаў канца XIX – пачатку XX ст. Яны ўяўляюць сабой першыя спробы комплекснага аналізу грамадска-палітычный гісторыі Беларусі. Асноўнымі задачамі працы "Очерки истории Кривической и Дреговической земель до конца XII столетия" (Кіеў, 1891) М.В. Доўнар-Запольскага былі: прааналізаваць геаграфічнае становішча Тураўскага, Смаленскага і Полацкага княстваў у палітычных адносінах і прасачыць іх эвалюцыю[1]. На недастатковую распрацаванасць гісторыі Смаленскай і Полацкай зямель указвае П.В. Галубоўскі ў прадмове да сваёй працы "История Смоленской земли до начала XV столетия". У манаграфіі, дзе асноўная ўвага скіравана на першакрыніцы, разглядаецца як палітычная гісторыя ды грамадскі лад Смаленшчыны, так і прырода краіны, а таксама сацыяльна-эканамічнае развіццё[2]. Па тэрытарыяльнаму прынцыпу напісаны таксама манаграфіі "Очерк истории Полоцкой земли до конца XIV столетия" В. Данілевіча (Кіеў, 1896) і "Пинское Полесье"



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

А. Грушэўскага (Кіеў, 1901). Аднак перыяд феадальнай раздробненасці асобна не выдзяляецца ў гэтых працах. Характэрным для іх з'яўляецца імкненне па магчымасці поўна аднавіць карціну гістарычнага развіцця беларускіх зямель у яго храналагічнай паслядоўнасці ў пэўны адрэзак часу. Вызначэнне храналагічных межаў гэтага адрэзку абумоўлівалася з'яўленнем першых звестак у пісьмовых крыніцах і пераломным момантам у палітычным развіцці аб'екта даследавання – часцей за ўсё ўваходам у склад Вялікага княства Літоўскага. Такім чынам, перыяд феадальнай раздробненасці лагічна ўключаўся ў агульнае рэчышча даследавання і ацэньваўся пры гэтым як неспрыяльны для станаўлення беларускай дзяржаўнасці.

М.В. Доўнар-Запольскі ва ўзгаданай вышэй працы, хаця і не выдзяляе час феадальнай раздробненасці ў асобны перыяд, прапануе крыху іншы падыход да перыядызацыі раннесярэднявечнай гісторыі Беларусі. Пераломным момантам у гісторыі Крывіцкай і Дрыгавіцкай зямель ён называе канец XII ст. і ў сувязі з гэтым выдзяляе тры аспекты: 1) усталяванне і выдзяленне як цэнтра на захадзе Смаленскага княства; 2) скіраванне інтарэсаў Полацкага княства на захад да немцаў і літоўцаў, а ў самім княстве – абуджэнне грамадскага жыцця; 3) набыццё пэўнай самастойнасці Турава-Пінскай вобласцю з перанясеннем цэнтра ў Пінск[3]. Такім чынам, менавіта ў XII ст. фарміруюцца моцныя рэгіянальныя цэнтры, якімі сталі Смаленскае і Турава-Пінскае княствы, а таксама вызначаецца вектар палітычнага развіцця Полацкай зямлі, што рэльефна праявіўся ў сярэдзіне XIII ст. Гэта азначае, што феадальная раздробненасць мела пазітыўныя вынікі для дзяржаўна-палітычнага развіцця беларускіх зямель.

Для ўсіх згаданых вышэй даследаванняў характэрным з'яўляецца надзвычай грунтоўны аналіз летапісных звестак, які дазволіў максімальна ўзнавіць палітычную гісторыю Беларусі ранняга сярэднявечча. Таму і сёння гэтыя працы ўяўляюцца надзвычай актуальнымі і карыснымі пры вывучэнні палітычных аспектаў развіцця беларускіх зямель у вывучаемы перыяд.

У савецкі час акцэнт з палітычнай гісторыі перамяшчаецца на сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі. Адмаўленне савецкай гістарыяграфіяй факта існавання беларускай дзяржаўнасці абумовіла ўзнікненне адпаведнага падыходу да сярэднявечнай гісторыі, у межах якога перадача Уладзімірам Кіеўскім Полацкага княства Ізяславу трактавалася як пачатак драблення Кіеўскай Русі. Таму распад Полацкага княства на шэраг дробных удзелаў разглядаўся як паглыбленне раней распачаўшайся тэндэнцыі. Пры гэтым сцвярджалася, што ў перыяд феадальнай раздробненасці становішча народных мас пагаршаецца з-за несупынных войнаў, узмацняецца феадальны прыгнёт, працягваецца наступленне феадалаў на абшчынныя землі, што прыводзіць да эканамічнага і палітычнага паслаблення Полацкага княства, у выніку чаго яно становіцца лёгкай здабычай для балтыйскіх плямёнаў[4].

Пільная ўвага да сацыяльна-эканамічнай гісторыі грамадства прывяла да развіцця археалогіі. Археалагічныя дадзеныя, уключаныя ў даследаванне старажытнай гісторыі Беларусі, значна ўзбагацілі яе і пашырылі ўяўленне аб перыядзе феадальнай раздробненасці, які па-ранейшаму разглядаўся як частка Полацкага перыяду, аднак цяпер дэталёва распрацоўваліся сацыяльна-эканамічныя аспекты. Гэтаму ў вялікай ступені спрыяў тэрытарыяльны падыход да вывучэння старажытнай гісторыі Беларусі. З 60-х да першай паловы 80-х гадоў з'яўляюцца асобныя манаграфіі, прысвечаныя Полацкай зямлі (Л.В. Алексеев "Полоцкая земля", 1966), старажытнаму Менску (Э.М. Загорульский "Древний Минск", 1963), Наваградку (В.Д. Гуревич "Древний Новогрудок", 1981). Асаблівая ўвага ў гэты час надавалася праблеме ўзнікнення і эвалюцыі гарадоў (М.Н. Тихомиров "Древнерусские города", 1956; Г.В. Штыхов "Города Белоруссии по летописям и раскопкам",



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

1975; Г.В. Штыхов "Города Полоцкой земли", 1978; Ю.Л. Заяц "Заславль в эпоху феодализма", 1995 і інш.). Археалагічныя даследаванні дазволілі прааналізаваць развіццё гандлю і рамёстваў, сельскай гаспадаркі і жывёлагадоўлі, а таксама зрабіць выснову пра відавочны рост гарадоў, які прыпаў менавіта на час феадальнай раздробненасці. Супярэчнасць агульнапрынятай негатыўнай ацэнкі гэтага перыяду і відавочны сацыяльна-эканамічны ўздым беларускіх зямель прывялі да выпрацоўкі новай трактоўкі дадзенай гістарычнай з'явы. Так, вядомы расійскі даследчык Б.А. Рыбакоў робіць выснову, што усобіцы князей на Русі, як і ў еўрапейскім сярэднявеччы, спадарожнічалі (і ў значнай ступені перашкаджалі) гістарычнаму руху, але не вызначалі ў поўнай ступені тую ці іншую палітычную форму, паколькі асноўныя формы сацыяльнага, палітычнага і эканамічнага жыцця захоўваліся і паступова развіваліся на працягу ўсяго гэтага перыяду і ў далейшым на пачатку працэсу кансалідацыі зямель вакол новага цэнтра. Пры гэтым пачатковая стадыя перыяду феадальнай раздробненасці характарызуецца не заняпадам культуры і эканомікі, а, наадварот, ростам гарадоў, росквітам мастацтва і, на думку даследчыка, гэты перыяд з'яўляецца вельмі складаным, супярэчлівым этапам, своеасаблівым вынікам папярэдняга генезісу, калі дзяржава дасягнула поўнага росквіту і ўзніклі перадумовы для новай ступені гістарычнага развіцця. Аднак і пасля яго заканчэння феадальны лад захаваўся, і таму феадальную раздробненасць трэба разглядаць як пераразмеркаванне палітычнай і эканамічнай магутнасці, у выніку чаго роля лідэра пераходзіць да больш перспектыўных дзяржаўных утварэнняў, адбор якіх і ажыццяўляецца ў ходзе міжусобіц[5]. Дадзеная канцэпцыя ўключае ў аналіз значэння перыяду феадальнай раздробненасці як сацыяльна-эканамічны, так і палітычны аспекты, аднак амаль не ўлічвае яго спецыфіку на беларускіх землях.

Узаемаўплыў і ўзаемазалежнасць сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця ў перыяд беларускай феадальнай раздробненасці падкрэслівае М.І. Ермаловіч, які адзначае, што ў нетрах дадзенага працэсу выспявалі ўмовы і для яго адмірання. Менавіта ў гэты перыяд ствараюцца лепшыя магчымасці для засваення новых зямель і прыродных рэсурсаў, росту гарадоў, развіцця земляробства і рамёстваў. Усё пералічанае спрыяла таварнай вытворчасці, што вяло да эканамічнага і палітычнага збліжэння асобных зямель. Таму, чым раней пачынаецца працэс драблення феадальнага дзяржаўнага ўтварэння, тым хутчэй ён заканчваецца і прыводзіць да стварэння новай дзяржавы. Такім чынам, перыяд раздробненасці, на думку М.І. Ермаловіча, стымулюе дзяржаваўтваральныя працэсы ў феадальным грамадстве[6].

Аналіз гістарыяграфіі, прысвечанай названаму перыяду на беларускіх землях, паказаў, што пры наяўнасці дастаткова грунтоўных распрацовак праблема патрабуе далейшага даследавання. Стварэнню цэласнага ўяўлення пра вывучаемы гістарычны перыяд, безумоўна, перашкаджаюць слабая забяспечанасць пісьмовымі крыніцамі і поўная фрагментарнасць археалагічных дадзеных. Наяўныя архіўныя матэрыялы добра вядомы – гэта пераважна старажытнарускія летапісы, некаторыя польскія і нямецкія хронікі. У сувязі са старажытнасцю перыяду даследавання цяжка разлічваць на магчымасць увядзення ў навуковы зварот новых гістарычных дакументаў. Аднак нават наяўныя звесткі дазваляюць больш паглыблена аналізаваць прычыны драблення Полацкага княства, узвышэння поўнага рэгіянальнага цэнтра на розных этапах феадальнай раздробненасці, гісторыю ўзаемадачыненняў паміж асобнымі княствамі і іх уладарамі, а таксама з суседнімі землямі, агульныя і своеасаблівыя рысы грамадска-палітычнага ладу розных беларускіх зямель у XII–XIII ст.

Вывучэнне старажытнай гісторыі Беларусі ў савецкі час было пераважна пабудавана па тэрытарыяльнаму прынцыпу, калі паэтапна даследаваліся



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

асобныя тэрыторыі. Дамінанта археалагічных звестак гэтага тыпу, безумоўна, паспрыяла больш дакладнаму ўзнаўленню гістарычнай карціны таго часу, аднак не надала ёй цэласнасці перш за ўсё таму, што грамадска-палітычнаму развіццю ў іх удзялялася другаснае значэнне. Засяроджанасць на ўнутраным генезісе адной тэрыторыі прывяла да разрозненасці ведаў аб перыядзе феадальнай раздробненасці на беларускіх землях у цэлым. Пры гэтым некаторыя рэгіёны з іх цэнтрамі аналізаваліся, а некаторыя практычна засталіся па-за межамі ўвагі даследчыкаў. Не вывучаліся грунтоўна і тыя сувязі, якія існавалі паміж асобнымі землямі ў XII–XIII ст., таму перыяд феадальнай раздробненасці выглядае на дадзены момант як гісторыі асобных зямель, мала звязаныя паміж сабой.

Каб комплексна прааналізаваць развіццё беларускіх зямель у XII–XIII ст., трэба выдзеліць час феадальнай раздробненасці ў асобны перыяд і падзяліць яго на шэраг этапаў. Мэта паэтапнага даследавання адзначаных працэсаў – сабраць максімальную колькасць звестак аб тагачасным развіцці ўсёй тэрыторыі Беларусі, комплексна даследаваць не толькі самыя буйныя (Полацак, Менск, Віцебск, Смаленск, Тураў, Пінск, Наваградак), але і больш дробныя рэгіянальныя цэнтры, такія як Берасьце, Гародня, Друцк, Заслаўе, Клецак, Слуцак, Мазыр* і іншыя, іх узаемадачыненні. Мэтазгодна выкарыстоўваць тэрмін "рэгіянальны цэнтр" для вызначэння палітычнага і гандлёвага цэнтра рэгіёна, які на пэўных этапах гістарычнага развіцця мог быць і цэнтрам удзельнага княства. Тэрмін "рэгіянальны цэнтр" з'яўляецца больш ёмістым паняццем, чым "цэнтр удзельнага княства", і дазваляе больш дакладна прасачыць працэс узвышэння і заняпаду асобных беларускіх зямель у названы перыяд, пры гэтым сістэмны падыход робіць магчымым пастаноўку новых задач: перш за ўсё зрабіць параўнальны аналіз грамадска-палітычных і эканамічных працэсаў, якія адбываліся ў розных княствах. Выяўленне іх падабенства і адрознення прывядзе да высвятлення прычын і механізмаў змены дзяржаўнага лідэра, якая адбылася ў выніку феадальнай раздробненасці. Параўнальны аналіз дазваляе скласці больш поўнае ўяўленне аб зменах у грамадскім ладзе як у асобных княствах, так і ў цэлым на тэрыторыі Беларусі. Акрамя таго, параўнальны аналіз прадугледжвае вывучэнне і ўключэнне ў рэчышча гісторыі беларускіх зямель у перыяд феадальнай раздробненасці тых тэрыторый, якія менш даследаваліся, асабліва ў савецкі час, у сувязі з канцэнтрацыяй інтарэсаў навукоўцаў на падзеях Полацкага княства і Навагрудчыны.

Слабая забяспечанасць крыніцамі інфармацыі, безумоўна, ускладняе правядзенне комплекснага даследавання аналізуемага перыяду на Беларусі. Пераадолець гэтую складанасць дапамагае не толькі шырокае выкарыстанне археалагічных звестак, іх параўнанне з летапіснымі і верыфікацыя дадзеных са страчаных матэрыялаў з археалагічнымі знаходкамі. Вывучэнне працэсаў, якія адбываліся ў перыяд феадальнай раздробненасці на суседніх славянскіх землях, сведчыць пра тое, што яны былі аналагічнымі тым, якія мелі месца на Беларусі.

Сістэмны аналіз XII–XIII ст. уключае ў сябе таксама сферу рэлігійнай гісторыі гэтага часу. Пытанне распаўсюджвання і замацавання хрысціянства на Беларусі ў гэты перыяд не атрымала належнай распрацоўкі ў беларускай гістарыяграфіі. Па-за ўвагай даследчыкаў застаецца ментальная гісторыя, якую магчыма і неабходна вывучаць пры дапамозе назапашаных археалагічных матэрыялаў пра тагачасны быт і інтэрпрэтацыі тэкстаў пісьмовых крыніц.

Названыя працэсы пры ўмове пашырэння храналагічных межаў даследавання феадальнай раздробненасці на XIII ст. дазваляюць сфарміраваць

* У дадзеным выпадку выкарыстоўваюцца старажытныя назвы гарадоў і рэгіянальных цэнтраў.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.

To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

цэласную карціну гістарычнага развіцця Беларусі у гэты перыяд, усвядоміць яго як асобны этап у дзяржаўным развіцці краіны і ліквідаваць той прабел, які доўгі час існаваў у беларускай гісторыі.

[1] Гл.: Довнар-Запольский М. Очерки истории Кривической и Дреговической земель до конца XII столетия. Киев, 1891. С. V.
[2] Гл.: Голубовский П.В. История Смоленской земли до начала XV столетия. Киев, 1895. С. I.
[3] Гл.: Довнар-Запольский М. Указ. тв. С. VI.
[4] Гл.: История БССР: В 2 ч. Мн., 1981. Ч. 1. С. 52.
[5] Гл.: Рыбаков Б.А. Киевская Русь и русские княжества. М., 1982. С. 470.
[6] Гл.: Ермаловіч М.І. Па слядах аднаго міфа. Мн., 1989. С. 10.

***Віданава Ірына Аляксееўна*** – аспірантка кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў. Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык названай кафедры П.А. Лойка.

*Л.В. МІКАЛАЕВА*

## ЗНЕШНЕПАЛІТЫЧНАЕ СТАНОВІШЧА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ПАЧАТКУ XVI ст.

Знешняя палітыка Вялікага княства Літоўскага пачатку XVI ст. была прадвызначана агульнай міжнароднай сітуацыяй ва усходнееўрапейскім рэгіёне, што абумовіла змест яе асноўных накірункаў. Геапалітычнае становішча дзяржавы дамінавала ў гэты перыяд у выбары партнёраў і развіцці ўзаемаадносін з яе праціўнікамі. У цэлым знешнепалітычнае становішча Вялікага княства Літоўскага ў пачатку XVI ст. можна характарызаваць як складанае і нават трагічнае. К канцу XV ст. Княства ўжо не мела ваенна-палітычнага патэнцыялу, неабходнага для ўтрымання ўсёй сваёй велізарнай дзяржаўнай тэрыторыі. Яшчэ раней, у часы кіравання вялікага князя Казіміра Ягайлавіча (1440–1492), ВКЛ адмовілася ад наступальнай агульнарускай праграмы, хаця былі і зручныя сітуацыі, якія дазвалялі і надалей пашыраць тэрыторыю. Гэты перыяд супаў па часе з поспехамі палітыкі Масквы і яе ўзмацненнем. З геапалітычнага пункту гледжання ваенна-палітычная ініцыятыва ва усходнееўрапейскім рэгіёне да пачатку XVI ст. перайшла ад Вялікага княства Літоўскага да Маскоўскай дзяржавы, межы якой сутыкаліся з беларуска-літоўскімі. Супрацьстаянне дзвюх найбуйнейшых дзяржаў Усходняй Еўропы, асноўнай праблемай у дачыненнях якіх яшчэ з XIV ст. з'яўлялася так званая "спадчына Рурыкавічаў" – землі, населеныя пераважна праваслаўным насельніцтвам, якія ў IX–XII ст. уваходзілі ў сістэму княстваў Русі, немінуча вылілася ў адкрытыя ваенныя дзеянні. Прычым маскоўскі вялікі князь Іван III падрыхтаваўся да іх пачатку значна лепш, стварыўшы антыягелонскую кааліцыю, у якую, акрамя Масковіі, увайшлі яшчэ Крымскае ханства і Малдаўскае княства. Сам факт стварэння азначанай кааліцыі, на наш погляд, можна ацэньваць як прыватны выпадак дзеяння сістэмы палітычнай раўнавагі, што пачала наладжвацца ў агульнаеўрапейскім маштабе і рабіла немагчымым існаванне дзяржавы-гегемона ў пэўным рэгіёне.

У выніку распачатай па ініцыятыве Масквы вайны 1492–1494 гг. ВКЛ панесла першыя тэрытарыяльныя страты. Мірная дамова ад 5 лютага 1494 г. зафіксавала новую мяжу паміж дзяржавамі[1]. Мір быў замацаваны шлюбам вялікага князя літоўскага Аляксандра з дачкой Івана III Аленай. Але дынастычны шлюб не вырашыў усіх супярэчнасцей і нават, як паказалі далейшыя падзеі, выкарыстоўваўся Іванам III для інспіравання новых зачэпак для вайны з ВКЛ. Да таго ж яшчэ падчас вайны 1492–1494 гг. маскоўскі гаспадар пачаў выкарыстоўваць тытул "государь всея Руси"[2], які заключаў у сабе адкрытую прэтэнзію на населеныя славянскім і пераважна праваслаўным насельніцтвам землі ВКЛ ("рускія" землі па тагачаснай тэрміналогіі), тым



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm